**Коммуникативная** компетенция: принципы, методы, прие-
К63 мы формирования: сб. науч. ст. / Белорус.гос.ун-т; в
авт. ред. – Мн., 2009. – Вып. 9. – 102 с.

*Л. М. Гамеза*

# ЛІНГВАМЕТАДЫЧНАЯ ПАРАДЫГМА ЎЗБАГАЧЭННЯ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Узбагачэнне слоўнікавага запасу школьнікаў да 70-х гадоў XX ст. у тэорыі методыкі выкладання мовы і ў школьнай практыцы разглядалася як слоўнікавая работа, што праводзіцца ў аспекце развіцця маўлення (С. І. Абакумаў, П. А. Афанасьеў, В. А. Дабрамыслаў, М. А. Рыбнікава, А. В. Цекучоў). У 80-я гады ў сувязі з уключэннем у праграму па рускай, затым па беларускай мовах для вывучэння ў V класе новага раздзела "Лексіка. Фразеалогія" задача ўзбагачэння слоўніка школьнікаў пашыраецца за кошт увядзення ў іх актыўны запас моўных аб’яднанняў слоў (тэматычных, лексіка-тэматычных груп слоў, сінанімічных радоў, антанімічных пар, экспрэсіўнай, вобразна-выяўленчай лексікі), ужыванне якіх дазваляе адабраць для любога выказвання неабходныя словы (М. Т. Баранаў, В. І. Капінос, В. П. Красней, А. Ю. Купалава, Т. А. Ладыжанская).

З сярэдзіны 90-х гадоў лінгвацэнтрычны сістэмна-апісальны падыход да навучання мове змяніўся на антрапацэнтрычны сістэмна-функцыянальны, камунікатыўна-дзейнасны. А гэта азначае, што для распрацоўкі методыкі неабходна звяртаць увагу не толькі на характар лінгвістычнага матэрыялу, але і на моўную асобу вучня. Рэалізацыя новых падыходаў да навучання мове патрабуе таго, каб улічваліся наступныя вывады педагогаў і псіхолагаў па пытанні ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў у працэсе даследаванняў і на аснове эксперыментаў:

1) слоўнікавы запас школьнікаў павінен узрастаць колькасна ад класа да класа пры вывучэнні ўсіх раздзелаў роднай мовы, бо аб’ектам вывучэння ўсіх моўных узроўняў з’яўляецца слова (фанетычнае, арфаграфічнае, марфалагічнае і інш.);

2) наяўнасць дакладных і стабільных колькасных характарыстык развіцця слоўнікавага запасу ў межах кожнага ўзросту;

3) раўнамернае ўзбагачэнне слоўнікавага запасу асобы вучня на аснове адзінства метадычных прынцыпаў бесперапыннасці, паступовасці, ажыццяўлення ўнутрыпрадметных сувязей;

4) моўная асоба з’яўляецца складнікам трох кампанентаў: вербальна-семантычнага (валоданне семантыкай), тэзаўруснага (веданне сістэмных сувязей моўных з’яў), прагматычнага (адэкватнае выкарыстанне моўных з’яў);

5) якаснае пераўтварэнне слоўнікавага запасу адбываецца побач з яго колькаснымі зменамі;

6) узбагачэнне слоўніка школьнікаў неабходна праводзіць з улікам тыпу, стылю і жанру маўлення. Так, найбольш высокі паказчык слоўнікавага запасу адзначаецца ў сачыненнях-апавяданнях, сярэдні – у сачыненнях-апісаннях, самы малы – у сачыненнях-разважаннях.

7) пры навучанні мове на аснове сістэмна-функцыянальнага, камунікатыўна-дзейнаснага, лінгвакультуралагічнага падыходаў моўная з'ява вывучаецца ў сукупнасці граматычнага, семантычнага, функцыянальнага аспектаў, а таксама фарміруецца моўная (лінгвістычная), маўленчая і лінгвакультуралагічная кампетэнцыя вучняў [1; 4–7].

У плане фарміравання моўнай кампетэнцыі задачы ўзбагачэння слоўнікавага запасу вучняў заключаюцца ў авалоданні сутнасцю, ўзаемасувязямі (лексічнымі, лексіка-граматычнымі) моўных паняццяў; здольнасці імі карыстацца ў розных відах маўленчай дзейнасці.

У плане фарміравання маўленчай кампетэнцыі задачы ўзбагачэння слоўнікавага запасу зводзяцца да ўвядзення ў актыўны лексікон вучняў маўленчых паняццяў, выпрацоўцы на іх аснове маўленчых уменняў, неабходных для стварэння тэкстаў.

Пры фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі задачы ўзбагачэння слоўнікавага запасу заключаюцца ў здольнасці ствараць выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў, выкарыстоўваючы адпаведную лексіку, вобразна-выяўленчыя сродкі мовы.

У ходзе фарміраванні лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі задачы ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў заключаюцца ў засваенні і здольнасці карыстацца вялікім пластам лексікі, якая захоўвае і перадае каштоўнасці культуры, культуразнаўчыя звесткі.

У сувязі з тым, што багаты лексікон – неад'емная частка і ўмова маўленчага развіцця асобы, яго ўзбагачэнне павінна з'яўляцца асноўным патрабаваннем школьнай праграмы па беларускай мове і ў сувязі з гэтым важнейшым напрамкам у рабоце настаўніка-славесніка. У напрамку ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў лагічна, такім чынам, вылучыць вербальна-семантычны, тэзаўрусны і прагматычны ўзроўні.

Адсюль вынікае, што ў працэсе авалодання словам умоўна вылучаюцца: вербальна-семантычны ўзровень, які накіраваны на авалоданне лексічнымі, лексіка-граматычнымі і маўленчымі паняццямі (сінонімамі, антонімамі, амонімамі, мнагазначнасцю, аднакаранёвымі словамі, сродкамі сувязі слоў у сказах і г. д.), фарміраванне моўнай (лінгвістычнай) і маўленчай кампетэнцыі; тэзаўрусны ўзровень, накіраваны на навучанне практычнаму выкарыстанню гэтых паняццяў на ўсіх моўных узроўнях для стварэння звязных выказванняў (складанню сінанімічных радоў, антанімічных пар, лексіка-семантычных, лексіка-граматычных і тэматычных груп слоў, асэнсаванню сістэмных сувязей лексіка-семантычнага, лексіка-граматычнага ўзроўняў, ужыванню слоў у словазлучэннях, сказах), фарміраванне моўнай, а таксама маўленчай кампетэнцыі; прагматычны ўзровень накіраваны на забеспячэнне камунікатыўных патрэб школьнікаў, фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі – стварэнне са словамі тэкстаў у розных

сітуацыях маўлення, розных тыпаў, стыляў, вызначэнне сітуацыі маўлення: адрасата, месца, мэту; адбор адпаведнай лексікі, моўных сродкаў для той ці іншай сітуацыі маўлення; параўнанне сітуацый маўлення, тыпаў, стыляў, вызначэнне моўных адрозненняў.

Паколькі слоўнікавы запас вучняў не з'яўляецца механічнай сукупнасцю асобных слоў, задачу яго ўзбагачэння нельга зводзіць да ўвядзення ў актыўны слоўнік асобных слоў і выразаў. Шукаючы ў памяці пэўнае слова або паняцце, чалавек рухаецца ўздоўж скразных па слоўнікавай сістэме структурных ліній – асацыятыўных або лагічных, улічваючы пры гэтым адносіны гіпаніміі (падпарадкавання), што дазваляе паслядоўна зменшыць вобласць няпэўнасці. Пры пошуку пэўнага слова гаворачы звяртаецца да падказанай сітуацыяй або камунікатыўнай задачай невялікай часткі слоўнікавага складу (сінанімічнаму раду, антанімічнай пары, тэматычнай, лексіка-семантычнай, лексіка-граматычнай групы), а гэта рэзка спрошчвае стратэгію пошуку [3, с. 7]. Таму аснова ўзбагачэння слоўніка – авалоданне сістэмнымі сувязямі лексіка-семантычнага, лексіка-граматычнага ўзроўняў: уводзіны ў маўленчую свядомасць вучняў лексіка-семантычных, лексіка-граматычных, тэматычных груп слоў, сінанімічных радоў, антанімічных пар; асэнсаванне школьнікамі лексічнай і граматычнай спалучальнасці слоў, іх функцыянавання ў тэкстах розных стыляў, тыпаў. Работа па авалоданні сістэмнымі сувязямі лексічнага і лексіка-граматычнага ўзроўняў асноўваецца на веданні семантыкі слова і праводзіцца з апорай на кантэкст. У гэтым выпадку ў вучняў будуць усе перадумовы для фарміравання ўмення асэнсаванага мэтанакіраванага словаўжывання, умення выбіраць лексічныя сродкі, адпаведныя тэме выказвання, тыпу, стылю маўлення.

Сучасныя падыходы да арганізацыі навучання беларускай мове абумоўліваюць прынцыпы ўзбагачэння слоўнікавага запасу: 1. Узбагачэнне слоўніка вучняў на аснове спасціжэння семантыкі і граматычнай афармленасці слоў; 2. Узбагачэнне слоўніка вучняў на аснове ўсведамлення сістэмных сувязей лексіка-семантычнага, лексіка-граматычнага ўзроўняў; 3. Узбагачэнне слоўніка вучняў на аснове спалучальнасці слоў; 4. Узбагачэнне слоўніка вучняў на аснове функцыянавання слова ў маўленні (тэкстах пэўных тыпаў, стыляў).

Вывучэнне моўных з'яў у адзінстве граматычнага, семантычнага, функцыянальнага аспектаў дазваляе вылучыць новы змест узбагачэння слоўніка школьнікаў: лексічныя, лексіка-граматычныя, маўленчыя з'явы школьнага курса беларускай мовы.

Для рэалізацыі ўзбагачэння слоўнікавага запасу на аснове сучасных падыходаў да навучання неабходна сістэма практыкаванняў, якая на вербальна-семантычным узроўні прадугледжвае знаёмства з пэўнымі лексічнымі, лексіка-граматычнымі, маўленчымі паняццямі, выяўленне семантыкі незразумелых слоў, выбар прыёму семантызацыі слова, фарміраванне фанетычна правільнага вымаўлення, правільнага напісання, засваенне арфаэпічных, інтанацыйных і арфаграфічных нормаў беларускай літаратурнай мовы; на тэзаўрусным узроўні прадугледжвае заданні на падбор

сінонімаў, антонімаў, амонімаў да слова, стварэнне лексіка-семантычных, лексіка-граматычных і тэматычных груп слоў, словаўтваральных тыпаў слоў, ужыванне слоў у словазлучэннях, сказах; на прагматычным узроўні ўключае практыкаванні на мэтанакіраванае выкарыстанне і аналіз лексічных сродкаў у тэкстах розных стыляў і тыпаў.

Матэрыялам для практыкаванняў вербальна-семантычнага ўзроўню з'яўляюцца сінонімы, антонімы, амонімы, прафесіяналізмы, аднакаранёвыя словы, марфемы, часціны мовы і інш., ілюстрацыйны моўны матэрыял пры вывучэнні гэтых паняццяў. Матэрыялам для практыкаванняў тэзаўруснага ўзроўню служаць сістэмныя лексіка-семантычныя, лексіка-тэматычныя, лексіка-граматычныя групы слоў, якія дазваляюць адабраць для выказвання пэўнага тыпу, стылю адпаведную лексіку. Матэрыялам для практыкаванняў прагматычнага характару служаць функцыянуючыя ў маўленні словы, адпаведныя лексічныя, лексіка-граматычныя сродкі маўлення, якія абапіраюцца на лінгвістычныя веды школьнікаў, набытыя ў працэсе вывучэння раздзелаў школьнага курса беларускай мовы і накіраваныя на фарміраванне індывідуальна-кантэкстуальных уменняў выяўлення функцыі слова, трапнага ўжывання слова ў адпаведнасці з тыпам, стылем, жанрам маўлення, мэтанакіраванай замены слова блізкім або супрацьлеглым па значэнні і інш.

I. Практыкаванні вербальна-семантычнага ўзроўню

У гэтую групу ўключаюцца:

- практыкаванні-знаёмствы з лексічнымі, лексіка-граматычнымі і маўленчымі паняццямі. Абагульненыя фармулёўкі могуць быць наступнымі: *правільна вымавіце, знайдзіце, падкрэсліце, вызначце, выпішыце, выберыце правільны адказ* і г. д.

- практыкаванні-копіі фармулёвак лексічных, лексіка-граматычных і маўленчых паняццяў: *адкажыце на пытанне, успомніце, дайце вызначэнне, працягніце* і г. д.

- практыкаванні на выпрацоўку аналітыка-сінтэтычных уменняў і навыкаў: *ахарактарызуйце, апішыце, сфармулюйце, састаўце схемы, прааналізуйце, растлумачце, абгрунтуйце, дакажыце, матывуйце згоду/нязгоду, карыстаючыся слоўнікам, знайдзіце, выканайце разбор* і г. д.

- практыкаванні-пераўтварэнні аналітыка-сінтэтычных уменняў і навыкаў у творчыя здольнасці: *замяніце, падбярыце, утварыце, перакладзіце, перабудуйце, трансфармуйце, пераўтварыце, састаўце, прыдумайце, дайце ацэнку* і г. д.

II. Практыкаванні тэзаўруснага ўзроўню

У гэтую групу ўключаюцца практыкаванні:

- на выяўленне сістэмных сувязей лексіка-семантычнага, лексіка-граматычнага ўзроўняў. Напрыклад: *карыстаючыся комплексным лексічным слоўнікам беларускай мовы, выявіце, ці з'яўляецца слова мнагазначным, амонімам? Ці магчыма падабраць да слова сінонімы, антонімы?*

- на падбор і групоўку слоў на пэўную тэму (складанне тэматычных, лексіка-граматычных і лексіка-семантычных груп слоў). Напрыклад:

*Састаўце лексіка-граматычную групу слоў - якасных прыметнікаў для апісання адзення, вызначэння яго колеру; запішыце словы, характэрныя, напрыклад, для прафесіі хлебароба; састаўце групу слоў на тэму "Беларуская прырода", выкарыстоўваючы безэквівалентную лексіку.*

- выяўленне валентнасных магчымасцей слова. Напрыклад:

*З якімі словамі спалучаюцца зборныя лічэбнікі? Складзіце некалькі словазлучэнняў у якасці прыкладаў. Раскажыце пра асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў па, у.*

- складанне словазлучэнняў і сказаў;

*Складзіце сказы з прапанаванымі словамі-сінонімамі. Выявіце семантычныя адценні слоў-сінонімаў.*

- аналіз лексіка-стылістычных сродкаў тэксту. Напрыклад, верш "Зімой" М. Багдановіча.

*У якім значэнні ўжываецца ў тэксце слова* ***звонкі****? Падбярыце да яго сінонімы. Чаму аўтар звяртаецца да вечара, як да чалавека, выкарыстоўваючы прывітанне: "Здароў!"* і г.д.

- рэдагаванне тэксту, выяўленне маўленчых памылак.

III. Практыкаванні прагматычнага ўзроўню

У гэтую групу ўключаюцца практыкаванні на выпрацоўку індывідуальна-кантэкстуальных уменняў і навыкаў:

- выяўленне асаблівасцей ужывання слова ў пэўнай маўленчай сітуацыі, у тэксце пэўнага стылю і тыпу. Напрыклад:

Для якой маўленчай сітуацыі характэрны словы *высокачастотны, рэзанансны, тэрапія; даражэнькі, бывай, маяцца.*

- мэтанакіраваны выбар слова для кантэксту. Напрыклад:

*Падабраць лексіку для апісання знешнасці чалавека, які знаходзіцца ў розыску;*

- параўнанне сітуацый маўлення, вызначэнне моўных адрозненняў. Напрыклад, *параўнайце дзве сітуацыі маўлення: паведамленне дыктара аб надвор'і і апісанне надвор'я ў сачыненні-апісанні. Выявіце мэту, адрасата, моўныя адрозненні выказванняў.*

- вызначэнне стылю і тыпу тэксту, сітуацыі маўлення: адрасата, месца, мэты;

- стварэнне вобразнага, эмацыянальнага, метафарычнага выказвання.

Усе слоўнікавыя практыкаванні папярэднічаюць заданням, накіраваным на стварэнне выказвання, і абапіраюцца на лінгва-тэарэтычныя веды вучняў, набытыя ў працэсе вывучэння маўленчай тэорыі, лексікі і фразеалогіі, на семантычны аспект граматычных тэм.

## *Літаратура*

1. *Богин, Г. И.* Современная лингводидактика: учеб. пособие / Г. И. Богин. – Калинин: Калинин. гос. ун-т, 1980. – 62 с.

2. *Долбик Е. Е.* Формирование языковой компетенции учащихся / Е. Е. Долбик // Актуальные направления методики преподавания русского языка в современной социокультурной ситуации: сб. науч. тр. – 2008. – С. 37–49.

3. *Залевская, А. А.* Слово в лексиконе человека. Психолингвистическое исследование / А. А. Залевская. – Воронеж: Изд-во Воронежского у-та, 1990, - 204 с.

4. *Караулов, Ю. Н.* Русский язык и языковая личность / Ю. Н. Караулов. – М.: Наука, 1987. – 261 с.

5. *Міхневіч, А. Я.* Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы / А. Я. Міхневіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 264 с.

6. *Мурына, Л. А.* Сістэмна-функцыянальны і камунікатыўна-дзейнасны падыходы пры навучанні мовам у школе /Л. А. Мурына, Г. М. Валочка // Беларус. мова і літ. – 2006. – №10. – С. 28–32.

7. *Мурына, Л. А.* Лінгвакультуралагічны падыход пры навучанні мовам у школе /Л. А. Мурына, Г. М. Валочка // Беларус. мова і літ. – 2006. – №11. - С. 34–38.